# СУЧАСНІ ВЕКТОРИ РОЗВИТКУ ТУРИЗМУ: ТЕНДЕНЦІЇ ТА ПЕРСПЕКТИВИ КРАЇН ЄВРОПЕЙСЬКОГО РЕГІОНУ




Репозиторий БарГУ

УДК 338.48 : 908 : 91 : 005.745

Рекомендовано до друку вченою радою
Тернопільського національного педагогічного університету
імені Володимира Гнатюка (протокол № 12 від 2 червня 2020 року)

**Рецензенти:**

***Колотуха О. В.*** – доктор географічних наук, професор кафедри менеджменту Льотної академії Національного авіаційного університету

***Горб К. М.*** – кандидат географічних наук, доцент кафедри міжнародних економічних відносин, регіональних студій та туризму Університету митної справи та фінансів

***Копер Н. Є.*** – кандидат географічних наук, заступник начальника відділу рекреації НПП «Гуцульщина»

Сучасні вектори розвитку туризму: тенденції те перспективи країн Європейського регіону: міжнародна монографія (колектив авторів / за заг. ред. Л. Заставецької). Тернопіль, 2020. 180 с.

ISBN 978-617-595-100-2

У монографії викладено результати комплексного дослідження сучасних тенденцій та напрямів розвитку туристичної галузі економіки в країнах Європейського регіону загалом та України, зокрема. Автори звернули увагу на сучасний стан та перспективи розвитку новітніх видів туризму (серед них – стоматологічний, повітряний, «похмурий» туризм та ін.). Велику увагу приділено туристичній освіті у Європейському регіоні, формуванню та розвитку екскурсійного туризму в Україні, виділено власні новітні туристично-рекреаційні райони у нашій країні.

Для вчених, туризмознавців, географів, економістів та всіх, хто цікавиться проблемами сучасного розвитку туристичної діяльності в країнах Європейського регіону.

*© Заставецька Леся, Зуеў Уладзімір, Zusková Klaudia, Horbacz Agata, Білецький Мирослав, Котик Любов, Заставецький Тарас, Дударчук Катерина, Романів Оксана, Філюк Світлана, Ілляш Ірина, 2020*

Репозиторий БарГУ

# ЗМІСТ

ПЕРЕДМОВА……………………………………………………………5

**Розділ 1. СУЧАСНІ ТЕНДЕНЦІЇ РОЗВИТКУ ТУРИСТИЧНОЇ ДІЯЛЬНОСТІ В ЄВРОПЕЙСЬКОМУ РЕГІОНІ**

1.1. Сучасні зміни в структурі туристичного попиту *(Леся Заставецька)*……………………………………6

1.2. Європейський регіон у структурі світового ринку туристичних послуг *(Леся Заставецька, Тарас Заставецький)*…….10

1.3. Адам Міцкевіч: сучасная ацэнка і інтэрпрэтацыя стамбульскага перыяду жыцця для стварэння новага турыстычнага прадукта *(Уладзімір Зуеў)*…………………………18

1.4. Turystyka i sporty w przyrodzie w ramach programu studiów Sport i rekreacja na Uniwersytecie P. J. Šafárika w Koszycach *(Klaudia Zusková, Agata Horbacz)*…………………………28

**Розділ 2. ТЕРИТОРІАЛЬНІ ВІДМІННОСТІ РОЗВИТКУ ЕКСКУРСІЙНОГО ТУРИЗМУ В УКРАЇНІ**

2.1. Загальна характеристика розвитку екскурсійного туризму в Україні *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*………………38

2.2. Поліський туристично-рекреаційний район *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*……………………………41

2.3. Карпатський туристично-рекреаційний район *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*……………………………44

2.4. Подільський туристично-рекреаційний район *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*……………………………51

2.5. Придніпровський туристично-рекреаційний район *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*……………………………56

2.6. Приморський туристично-рекреаційний район *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*……………………………59

2.7. Слобожансько-Донбаський туристично-рекреаційний район *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*……………………………63

2.8. Перспективи розвитку екскурсійного туризму в Україні *(Мирослав Білецький, Любов Котик)*……………………………66

Репозиторий БарГУ

**Розділ 3. НОВІТНІ ВИДИ ТУРИЗМУ: СУЧАСНИЙ СТАН ТА ПЕРСПЕКТИВИ РОЗВИТКУ**

3.1. Міжнародний стоматологічний туризм як перспективний туристичний продукт: погляд крізь призму світового досвіду *(Оксана Романів)*.......................75

3.2. Перспективи розвитку «похмурого» туризму в країнах Європи та в Україні

3.2.1. Потенціал «похмурого» туризму в країнах Європи *(Тарас Заставецький)*.......................103

3.2.2. Чорнобильська зона відчуження як дестинація туризму катастроф *(Леся Заставецька)*.......................1121

3.2.3. Перспективи та стратегія розвитку Чорнобильської зони як туристичної дестинації особливого типу *(Леся Заставецька)*...116

**Розділ 4. ІСТОРИКО-АРХІТЕКТУРИА СПАДЩИНА МІСТ: СУЧАСНИЙ СТАН, ПЕРСПЕКТИВИ ВИКОРИСТАННЯ В ТУРИЗМІ**

4.1. Історико-архітектурний потенціал м. Кракова, його значення для потреб туризму

4.1.1. Загальна історико-географічна характеристика Кракова *(Світлана Філюк)*.......................128

4.1.2. Зародження туристичної галузі в Кракові *(Світлана Філюк)*.......................137

4.1.3. Огляд історико-архітектурної спадщини Кракова *(Світлана Філюк)*.......................139

4.1.4. Перспективи використання історико–архітектурної спадщини Кракова в системі масового туризму *(Світлана Філюк)*.......................155

4.2. Історико-культурний потенціал стародавніх містечок як чинник розвитку туризму у Тернопільській області *(Катерина Дударчук, Ірина Ілляш)*.......................169

Відомості про авторів.......................178

Репозиторий БарГУ

**Розділ 3. НОВІТНІ ВИДИ ТУРИЗМУ: СУЧАСНИЙ СТАН ТА ПЕРСПЕКТИВИ РОЗВИТКУ**

3.1. Міжнародний стоматологічний туризм як перспективний туристичний продукт: погляд крізь призму світового досвіду *(Оксана Романів)*..........75
3.2. Перспективи розвитку «похмурого» туризму в країнах Європи та в Україні
3.2.1. Потенціал «похмурого» туризму в країнах Європи *(Тарас Заставецький)*..........103
3.2.2. Чорнобильська зона відчуження як дестинація туризму катастроф *(Леся Заставецька)*..........1121
3.2.3. Перспективи та стратегія розвитку Чорнобильської зони як туристичної дестинації особливого типу *(Леся Заставецька)*...116

**Розділ 4. ІСТОРИКО-АРХІТЕКТУРНА СПАДЩИНА МІСТ: СУЧАСНИЙ СТАН, ПЕРСПЕКТИВИ ВИКОРИСТАННЯ В ТУРИЗМІ**

4.1. Історико-архітектурний потенціал м. Кракова, його значення для потреб туризму
4.1.1. Загальна історико-географічна характеристика Кракова *(Світлана Філюк)*..........128
4.1.2. Зародження туристичної галузі в Кракові *(Світлана Філюк)*..........137
4.1.3. Огляд історико-архітектурної спадщини Кракова *(Світлана Філюк)*..........139
4.1.4. Перспективи використання історико–архітектурної спадщини Кракова в системі масового туризму *(Світлана Філюк)*..........155
4.2. Історико-культурний потенціал стародавніх містечок як чинник розвитку туризму у Тернопільській області *(Катерина Дударчук, Ірина Ілляш)*..........169

Відомості про авторів..........178

Репозиторий БарГУ

Репозиторий БарГУ

## 1.3. Адам Міцкевіч: сучасная ацэнка і інтэрпрэтацыя стамбульскага перыяду жыцця для стварэння новага турыстычнага прадукта

У рабоце разглядваецца стамбульскі этап жыцця Адама Міцкевіча (24.12.1798 — 26.11.1855) — славянскага польскамоўнага паэта, ураджэнца Беларусі, заснавальніка польскай рамантычнай паэзіі.

Імя Адама Міцкевіча — гэта не толькі паэтычная спадчына! Месцы жыцця і творчасці паэта з'яўляюцца турыстычнымі — Завоссе і Навагрудак (Беларусь), Вільня (Літва). Помнікі паэту знаходзяцца ў

розных гарадах краін Еўропы — Беларусь, Украіна, Літва, Польшча, Францыя, Расія.

У нашым даследванні мы разглядзелі стварэння новага турыстычнага прадукта, звязанага з імём Адама Міцкевіча, у Стамбуле. Важным для гэтага з'яўляецца інтэрпрэтацыя фактаў жыцця паэта, якія часам носяць цяжкі для ўспрымання палітычны характар, факталогію, звязаную з дзейнасцю шырокага кола людзей.

Галоўным сэнсам любога працэса інтэпрэтацыі, на думку В.Кліцуновай, з'яўляецца стварэнне у турыстаў незабываемага ўражання, якое напоўнена асаблівым зместам, заснаванага на эмацыйных і інтэлектуальных сувязях з аб'ектам спадчыны [2, с. 95].

Вымушаная эміграцыя паэта ў маі 1828 года ў Заходнюю Еўропу не толькі стала жыццёвым выпрабаваннем, але і адкрыла ў Міцкевіча новыя якасці. Ён праявіў сябе як грамадскі дзеяч, як аўтарытэтны лідэр мігрантаў з тэрыторыі Рэчы Паспалітай, якая была акупаваная Расійская імперыяй пасля трох падзелаў, як дыпламат, які мог дамаўляцца з супярэчлівымі дзяржаўнымі чыноўнікамі як ў еўрапейскіх дзяржавах, так і на Бліжнім Усходзе. Шматлікія даследванні біяграфіі паэта супярэчліва адносяцца да апошняга этапа жыцця паэта ў Стамбуле (Канстанцінопале), дзе ён апынуўся ў часы руска-турэцкай вайны. Маючы падтрымку польскіх эмігрантаў і дзяржаўных чыноўнікаў заходнееўрапейскіх дзяржаў, ён працаваў на ідэю стварэння ваеннага падраздзялення, якое на ваенным тэатры дзеянняў адстойвала б мэты вяртання незалежнасці літоўска-беларуска-польскай Рэчы Паспалітай. Гэта ідэя знайшла сваю падтрымку і ў Турцыі. Але поўнасцю завершыць свае пачынанне Адам Міцкевіч не паспеў. 26 лістапада 1855 года ён памірае. Існуе некалькі версій прычын яго смерці — ад інфекцыйнага захворвання да атручвання.

Значэнне стамбульскага (канстанцінопальскага) этапа жыцця Адама Міцкевіча можна разглядваць перш за ўсё як паказчык аўтарытэта гэтага чалавека. І таму невыпадкова ў Стамбуле працуе музей паэта, які падтрымліваецца з дзяржаўнага бюджэта. Гэты музей

Репозиторий БарГУ

на вуліцы Tatlı Badem Sk. №10 у раёне Beyoğlu пакуль малавядомы, але ён можа і павінен стаць важным турысцкім аб'ектам.

Адам Міцкевіч — вялікі сын беларускай зямлі. Ён нарадзіўся на хутары Завоссе, што ў 15 км на поўнач ад сучаснага горада Баранавічы, а на той момант — на тэрыторыі Расійскай імперыі (рыс.1).



Рысунак 1. Сучасны выгляд месца нараджэння А.Міцкевіча. Зараз — музей-сядзіба паэта

Репозиторий БарГУ

Сам сябе ён называў ліцвінам, а родную зямлю, былое Вялікае княства Літоўскае, услаўляў у сваіх паэтычных творах. Так, з прычыны сваёй адукацыі ўсе свае творы ён пісаў на польскай мове — дзяржаўнай мове Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, якая была падзелена ў канцы 18 стагоддзя паміж Расійская, Прускай і Аўстра-Венгерская імперыямі.

Яго сэрца спынілася, аднак, на тэрыторыі Асманскай імперыі, ў Канстанцінопале, сучасным Стамбуле. Міцкевіч нешмат часу не дажыў да свайго 57-годдзя.

Што прывяло Міцкевіча ў Стамбул? Здавалася бы, што жывучы ў Парыжы, дзе ён атрымаў цікавую работу ў Каледж-дэ-Франс, можна было б поўнасцю прысвяціць сябе творчасці.

11 верасня 1855 года ў восьмым часу вечара Адам Міцкевіч разам з Генрыхам Служальскім і князем Уладзіславам Чартарыйскім выехалі з Парыжа, з Ліёнскага вакзала. У Марселі яны селі на карабель «Табор», які даставіў іх у Канстанцінопаль (Стамбул) (рыс.2).



Рысунак 2. Выгляд Стамбула у сярэдзіне XIX ст.

Паэт з прыехаў сюды зусім не для паэзіі. За год да гэтага пачалася руска-турэцкая вайна, і менавіта ў Турцыі пачаў фарміравацца польскі легіён для барацьбы за адраджэнне Рэчы Паспалітай і для вызвалення яе ад ціску Расійскай імперыі. Галоўную ролю ў стварэнні гэтага легіёна меў менавіта Міцкевіч, на той момант не толькі паэт, але і публіцыст, грамадскі і палітычны дзеяч.

Але пражыўшы у Стамбуле літаральна некалькі дзён і атрымаўшы задавальненне ад стану і баявога духа польскага легіёна, Міцкевіч раптоўна памірае. Згодна «афіцыйнай» версіі, ад халеры, але, як гавораць відавочцы, ніводны з трох дактароў, якія пазней агледзялі



Рэпазіторый БарГУ

цела паэта, не заўважылі традыцыйнага халернага пацямнення твару пасля смерці. Неафіцыйная версія — атручванне [8].

Расійскій след — не адзіны сярод версій нечаканай смерці здаровага і адносна не старога чалавека, генія культуры народаў Усходняй Еўропы.

Для разумення ролі Адама Міцкевіча ў міжнароднай палітыцы таго часу неабходна больш падрабязна разгледзіць яго паходжанне і жыццё ў Парыжы.

Ён нарадзіўся ў сям'і адваката, збяднеўшага шляхціча-ліцвіна. Маць яго паходзіла з прыняўшых хрысціянства сям'і франкістаў Маеўскіх. Франкісты — гэта полухрысціянская містычная секта, заснаваная сярод польскіх яўрэяў Якавым Франкам і існаваўшая з сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XIX ст. Некаторыя гісторыці мяркуюць, што і жонка Міцкевіча, Цэліна Шыманоўская, была праўнучкай аднаго з франкісцскіх лідэраў Шлома бэн Элішы Шора з украінскага Рагаціна.

Адданы патрыёт і змагар за вызваленне свайго народа, Міцкевіч, аднак, не падзяляў нацыяналістычных забабонаў, якія існавалі ў асяроддзі польская інтэлігенцыі, ён выступаў супраць антысемітызма і выказваў сімпатыі да яўрэяў і у мастацкай творчасці, і ў грамадская дзейнасці.

Міцкевіч быў перакананы, што саюз палякаў і яўрэяў Польшчы прывядзе да духоўнага і матэрыяльнага адраджэння краіны (як некалі саюз Польшы і Літвы прывёў да палітычнай велічы Речы Паспалітой), нягледзячы на адрозненні двух народаў. Ён энергічна выказваўся ў абарону яўрэяў у сваіх лекцыях у Каледж-дэ-Франс у Парыжы (1840–1844) [4].

Міцкевіч падзяляў ідэі польскага філосафа-містыка Анджэя Тавяньскага, які быў, як і Міцкевіч, выразнікам ідэй польскага мессіанізма. Згодна з Тавяньскім, яўрэйскі, польскі і французскі народы складаюць трыадзіны Ізраіль якому наканавана выратаваць чалавецтва [3]. Гэтыя погляды знайшлі сваё адлюстраванне ў напісаным біблей скім стылем сачыненні Міцкевіча «Кнігі польскага народа і польскага пілігрымства» (1832), у якім праводзілася паралель паміж вяртаннем яўрэяў з паланення вавілонскага і заканчэннем пакутніцтва Польшчы. Адам Міцкевіч у гэтым творы пакуты Хрыста асацыірваў з гістарычным развіццём



Репозиторий БарГУ

Польшчы, а пакуты польскага народа сталі сваеасаблівай ахвярай Хрыста. Цела пахаванай Польшы павінна ўваскрэснуць [9].

Перакананы ў тым, што Польше давядзецца вызваліць еўрапейскія народы, а таксама вырашыць яўрэйскае пытанне, Міцкевіч прапанаваў у часы Крымскай вайны (1853–56) арганізаваць яўрэйскі легіён для барацьбы з Расіяй, падобны на ўжо існуючы Польскі полк генерала Замойскага і Казачы полк пад камандаваннем Садык-Пашы. З гэтым планам Міцкевіч звярнуўся да яўрэяў праз свайго памочніка Армана Леві (доктара французскай арміі, нашчадка крэшчаных яўрэяў, які зацікавіўся ў 1824–31 гг. іудаізмам пад уплывам Міцкевіча).

І Міцкевіч, і Леві, верагодна, меркавалі, што фарміраванне яўрэйскага легіёна — першы крок да адраджэння яўрэйскага народа [7].

Будучы пасланцамі ўплывовай польскай эміграцкай арганізацыі «Hotel Lambert» (ад назвы рэзыдэнцыі, у якой разварнуў сваю дзейнасць князь Адам Чартарыйскі), Міцкевіч і Леві мелі магчымасць размаўляць з вышэйшымі чыноўнікамі Асманская імперыі.



Рысунак 3. Міцкевіч на ложку ў Канстанцінопале, 1855 г., аўтар невядомы, фота з архіву Музея літэратуры

Хутка Міцкевіч і Леві атрымоўваюць пісьмовы дазвол на вярбоўку людзей у легіён.



Репозиторий БарГУ

Турэцкія ўлады ж разглядалі ідэю легіёна як магчымасць сабраць дадатковыя фінансавыя сродкі для вайны з Расіяй або накіраваць гэты атрад на ўціхаміраванне Палестыны [5].

Акрамя таго, князь Чартарыйскі, які бачыў рост папулярнасці Міцкевіча сярод эмігрантаў, пачаў закулісную барацьбу.

У адзін з вечароў Адам Міцкевіч адчуў недамаганне. Пачалася хвароба, якая па сваіх сімптомах нагадвала халеру. У тыя часы якіх-небудзь эфектыўных лекаў супраць халеры не існавала і гэта вызначыла вынік хваробы Адама (рыс.3).

26 лістапада Адам Міцкевіч памёр.

Якія таямніцы хавае дом, дзе памёр Адам Міцкевіч?

Сёння ў гэтым доме на Tatlı Badem Sk. №10 у еўрапейскім раёне Стамбула Beyoğlu — музей, які існуе ўжо болей 130 год і фінансуецца турэцкімі ўладамі [6] (рыс.4).

Ён створаны ў знак павагі да літаратурнага генія і грамадскага дзеяча, нашага земляка. У пакоі, дзе спынілася сэрца паэта — зараз імправізаваная магіла. Тут знаходзілася яго цела некалькі дзён у чаканні карабля, які перавёз яго спачатку ў Парыж. Пазней цела было пахавана ў замку Вавель у Кракаве.

На другіх паверхах музея адлюстраваная творчасць Адама Міцкевіча, прычым на трох мовах — польскай, турэцкай і англійская. Паэтычныя творы Адама тут размешчаны на маленькіх адрыўных календарах, лісткі з якога наведвальнікі могуць узяць з сабой.

Стамбульскі (канстанцінопальскі) этап жыцця Адама Міцкевіча вельмі кароткі — усяго тры месяцы. Тым не меньш ён стаў паказчыкам вялікага аўтарытэта гэтага чалавека як сярод эмігрантаў у Заходняй Еўропе, так і сярод дзяржаўных дзеячоў еўрапейскіх і бліжнеўсходніх дзяржаў. У яго жаданні ўдзельнічаць у стварэнні ваеннага атрада, які б магло ваяваць на ваенным тэатры руска-турэцкага канфлікта, праяўлялася жаданне бачыць сваю радзіму свабодная і незалежнай. Сваю роль мела і паходжанне Адама Міцкевіча — ён лёгка мог дамаўляцца як з польскімі мігрантамі, так і з прадстаўнікамі яўрэйскіх арганізацый.

Репозиторий БарГУ

Стамбульскі (канстанцінопальскі) завяршаючы этап жыцця Адама Міцкевіча стаў падцвярджэннем многіх талентаў гэтага чалавека, якія ўзгадваюцца ў экспазіцыі стамбульскага Музея паэта.



Рысунак 4. Музей Міцкевіча ў Стамбуле

Репозиторий БарГУ

Улічваючы пастаянную цікавасць да жыцця і творчасці нашага земляка, стамбульскі музей поэта можа і павінен стаць турыстскім аб'ектам, які будзе ўключацца ў маршруты турыстаў з Усходняй і Заходняй Еўропы.

Прапануемы намі маршрут мог бы праходзіць па вуліцах Стамбула, апісаных у дзённіках паплечнікаў Адама Міцкевіча.

У якасці аб'ектаў наведвання прапануюцца наступныя:

- раён Каракёй (Karakoy), куда прыплыў карабель з Міцкевічам і яго паплечнікамі;

- вежа Галата (Galata Kulesi) — з дзённікаў вядома, што Міцкевіч накіраваўся да месца размяшчэння праз кварталы Галаты. З вежы адкрываецца добры гарадскі пейзаж;
- Сабор Святога Духа і былы кляштар лазарыстаў па адрасу Cumhuriyet Cd, 125 — тут жыў у невялікім пакоі жыў Міцкевіч з сябрамі ў першы перыяд знаходжання ў Стамбуле. Сабор пабудаваны ў 1846 годзе для кангрэгацыі лазарыстаў. Архітэктар — Джузэпе Фасаці. Па папскаму дэкрэту 1876 г. атрымаў статус кафедральнага. Багаты інтэр'ер сабора, у якім захоўваюцца рэліквіі святых першы стагоддзяў хрысціянства, дапаўняе вялікі арган;
- Сядзіба Садык-пашы па адрасу: Pürtelaş Hasan Efendi, Özoğul Sk. No:20, 34427 Beyoğlu. Сядзібу часта наведваў Міцкевіч для сустрэч з чыноўнікамі султанскага двара і абмеркавання пытанняў стварэння польскага легіёну. Садык-паша — гэта імя ўзяў украінец Міхал Чайкоўскі (1804-1886), пісьменнік, журналіст, палітычны дзеяч, удзельнік паўстання 1830-1831 гг пасля эміграцыі і паступленню на службу ў турэцкую армію [1]. З жонкай Садык-пашы — Людвікай Снядзецкай Адам Міцкевіч быў знаёмы яшчэ з Вільні;
- Будынак па адрасу Serdar Omer Cd., Tatli Badem Sok.23, дзе зараз месціцца музей паэта. Уваход вольны. Экспазіцыя размяшчаецца на трох паверхах і прысвечана стамбульскаму этапу жыцця паэта. У некаторых пакоях адноўлена абстаноўка, якая была пры жыцці паэта — пісьменны стол, кніжныя паліцы. Сярод найбольш важных экспанатаў — арыгінальныя дакументы, фатаздымкі паэта, дзённікі, асабістыя лісты. Асобная фотавыстава прысвечна Канстанцінопалю-Стамбулу таго часу. У падвале дома знаходзіцца сімвалічная магіла паэта — у гэтым месцы знаходзілася цела паэта да яго адпраўкі ў Парыж.

На нашу думку, прапануемы турпрадукт можа быць папулярны для турыстаў з краін, дзе Адам Міцкевіч успрымаецца як знакаміты творца — Беларусь, Украіна, Літва, Польшча. Знаёмства з вышэйадзначанымі аб'ектамі павысіць эмацыйнасць наведвання Стамбула.

Репозиторий БарГУ

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. Жуков К.А. Поляки в Османской империи и России (60-70-е гг XIX в.) / К.А.Жуков // Проблемы национальиой стратегии. 2015. № 6. С.186-220.

2. Клицунова В.А. Интерпретация наследия в туризме. Новые подходы в эпоху экономики впечатлений / В.А.Клицунова. Минск: Экоперспектива, 2015. 219 с.

3. Травкина А.А. Специфика польского романтического мессианизма XIX в. / А.А.Травкииа // Вестник славянских культур. 2008. №3-4. Сс. 56-64.

4. Фалькович С.М. Участие Адама Мицкевича в деятельности польской политической эмиграции середины XIX в. / С.М.Фалькович // Славянский мир в третьем тысячелетии. 2018. Т.13. №1-2. Сс. 46-59.

5. Философов Д. Мицкевич в Турции / Д. Философов // Молва.1932. № 113.

6. Adam Mickiewicz Müzesi [Электронны рэсурс]. - Режім доступа: http://www.beyoglu.bel.tr/beyoglu-belediyesi/detay/Adam-Mickiewicz-Muzesi/181/1070/0

7. Fiećko J. Spór między Mickiewiczem a Krasińskim o miejsce żydów wśród polaków / J. Fiećko // Pamiętnik Literacki XCIX. 2008. Z.2. S. 5-21.

8. Jastrun M. Mieckiewicz / M.Jastrun. Warszawa: Panstwowy Inst.Wydawn., 1974.

9. Mickiewicz A. Ksiegi narodu i pielgrzymstwa polskiego / A.Mickiewicz // Pisma proza. Cz. 2. Warszawa, 1955.

Репозиторий БарГУ